**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па лінгвістычнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ І.А.Старавойтава
_____________

Рэгістрацыйны № ТД- ___________/ тып.

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасцей:**
**1-21 06 01 Сучасныя замежныя мовы (па напрамках);**
**1-02 03 06 Замежныя мовы (з пазначэннем моў);**
**1-02 03 08 Замежная мова (з пазначэннем мовы)**

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання
па лінгвістычнай адукацыі
________________ Н.П.Баранава
________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
_________________ С.А.Каспяровіч
_________________

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
_________________ І.У.Цітовіч
_________________

Эксперт-нормакантралёр
_________________
_________________

Мінск 2021

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Л. С. Кныш*, дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
*Т. Г. Казакевіч,* выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»;
*І. А. Бурдзялёва*, дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;

У. І. Куліковіч, загадчык кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
Кафедрай беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» (пратакол № _ ад __________ );

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» (пратакол № _ ад _________ );

Прэзідыумам Савета Вучэбна-метадычнага аб’яднання па лінгвістычнай аудукацыі (пратакол № _ ад _________ ).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сучасная беларуская мова» выкладаецца ў адпаведнасці з агульнымі мэтамі падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне выкладання замежных моў, а таксама для ажыццяўлення перакладчыцкай дзейнасці, якія прадугледжваюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-прафесійнай, практыка-арыентаванай кампетэнтнасці.

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі наступных нарматыўных дакументаў:

– адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)» зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 88;

– адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)» зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 88;

– адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з указаннем мовы)», зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 88;

– тыпавымі вучэбнымі планамі па напрамках спецыяльнасці 1-21 06 01-01 «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)» (рэгістрацыйны № Д 21-1-014/тып.), «Сучасныя замежныя мовы (пераклад)» (рэгістрацыйны № Д 21-1-015/тып.), зацверджанымі першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.І. Жуком 28.06.2013;

– тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» (рэгістрацыйны № А 08-1-014/тып.), зацверджаным першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.І. Жуком 10.07.2013;

– тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)» (рэгістрацыйны № А 02-1-013/тып.), зацверджаным першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.І. Жуком 10.07.2013.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» з’яўляецца фарміраванне сістэмы прафесійных кампетэнцый, неабходных пры вырашэнні задач у прафесійнай дзейнасці спецыяліста-выкладчыка (перакладчыка) пры ажыццяўленні вуснай і пісьмовай камунікацыі на беларускай мове, перакладзе з беларускай мовы і на беларускую, анатаванні і рэферыраванні прафесійна арыентаваных тэкстаў, вядзенні дзелавой дакументацыі, выступленні з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных **задач:**

– фарміраваць у студэнтаў цэласнае ўяўленне пра беларускую мову як рухомую сістэму на ўсіх яе ўзроўнях;

– выпрацоўваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай пры выкладанні дысцыпліны і ў перакладчыцкай практыцы;

– фарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

– выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, выпрацоўваць пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікцыі;

– садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

Вучэбная дысцыпліна ўваходзіць у цыкл агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін (дзяржаўны кампанент). Яна звязана ў першую чаргу з такой дысцыплінай, як «Сучасная руская мова», а таксма з цыклам вучэбных сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (дзяржаўны кампанент).

Асваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», напрамку спецыяльнасці 1-21 06 01-01 «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)» павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

  АК-4. Умець працаваць самастойна;
- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі на дзяржаўных мовах;
- АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

- САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;
- САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- САК-7. Умець арыентавацца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцей і ўлічваць асаблівасці каштоўнасна-сэнсавых арыентацый разнастайных сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і прафесійных супольнасцей і груп у пэўным соцыуме.

**прафесійных кампетэнцый:**

у арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці (выкладанне)

- ПК-7. Рыхтаваць даклады, матэрыялы да прэзентацый;

- ПК-8. Карыстацца глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і сродкамі тэлекамунікацый.

Асваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», напрамку спецыяльнасці 1-21 06 01-02 «Сучасныя замежныя мовы (пераклад)» павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;
- АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;
- АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі;
- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі на дзяржаўных мовах;
- АК-14. Валодаць метадамі аналізу праблемных сітуацый у сферы прафесійнай дзейнасці.

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

- САК-7. Умець арыентавацца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцей і ўлічваць асаблівасці каштоўнасна-сэнсавых арыентацый разнастайных сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і прафесійных супольнасцей і груп у пэўным соцыуме.

**прафесійных кампетэнцый:**

у вытворча-практычнай дзейнасці (перакладчыцкая)

- ПК-27. Валодаць дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь (беларуская, руская), дзвюма або больш замежнымі мовамі як сродкам ажыццяўлення сваёй прафесійнай дзейнасці;
- ПК-36. Валодаць навыкамі публічнага маўлення, мець выразную дыкцыю.

Асваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

  АК-4. Умець працаваць самастойна;
- АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі на дзяржаўных мовах;
- АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

- САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;
- САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;

- САК-7. Быць здольным да каштоўнасна-сэнсавай арыентацыі ў свеце;
- САК-8. Быць талерантным да іншых культур і рэлігій.

**прафесійных кампетэнцый:**

у арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці

- ПК-8. Карыстацца глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і сродкамі тэлекамунікацый.

Асваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)» павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

**акадэмічных кампетэнцый:**

- АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

  АК-4. Умець працаваць самастойна;
- АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

**сацыяльна-асобасных кампетэнцый:**

- САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці;
- САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
- САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;
- САК-7. Арыентавацца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцей;
- САК-8. Быць талерантным да іншых культур і рэлігій.

**прафесійных кампетэнцый:**

у арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці

- ПК-7. Рыхтаваць даклады, матэрыялы да прэзентацый;
- ПК-8. Карыстацца глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і сродкамі тэлекамунікацый.

Згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)», адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)» у выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;
– месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;
– сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;
– поўны набор прафесійнай лексікі;

**умець:**

– выкарыстоўваць беларускую мову ў прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з нормай і узусам;
– перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;
– складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні і г.д.

**валодаць:**

– правіламі сучаснай беларускай арфаграфіі і пунктуацыі;
– асновамі вуснай і пісьмовай камунікацыі на беларускай мове;
– прыёмамі і навыкамі перакладу з беларускай і на беларускую мову.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)» разлічана на 52 акадэмічныя гадзіны, з іх 34 акадэмічныя гадзіны – на семінарскія заняткі, 18 акадэмічных гадзін – на самастойную работу студэнтаў, працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 2 заліковыя адзінкі.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)» разлічана на 70 акадэмічных гадзін, з іх 34 акадэмічныя гадзіны – на семінарскія заняткі, 36 акадэмічных гадзін – на самастойную работу студэнтаў, працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 2 заліковыя адзінкі.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)» разлічана на 84 акадэмічныя гадзіны, з іх 50 акадэмічных гадзін – на семінарскія заняткі, 34 акадэмічныя гадзіны – на самастойную работу студэнтаў, працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 2 заліковыя адзінкі.

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

(па спецыяльнасці 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», па спецыяльнасці 1-02 03 06 «Замежныя мовы (з пазначэннем моў)»)

| Змест | Семінарскія заняткі |
|---|---|
| **Раздзел I. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў** | |
| *Тэма 1.* Уводзіны ў дысцыпліну.<br>Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў.<br>*Тэма 2.* Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў.<br>*Тэма 3*. Беларуская літаратурная мова і дыялекты. | 2 |

| | |
|---|---|
| **Раздзел II. Беларуская мова на сучасным этапе** | |
| *Тэма 4.* Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму.<br>*Тэма 5.* Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы | 2 |
| *Тэма 6.* Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы | 2 |
| *Тэма 7.* Марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы | 2 |
| *Тэма 8.* Назоўнік | 2 |
| *Тэма 9.* Прыметнік. Займеннік | 2 |
| *Тэма 10.* Лічэбнік | 2 |
| *Тэма 11.* Дзеяслоў | 2 |
| *Тэма 12.* Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Прыслоўе | 2 |
| *Тэма 13.* Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы | 2 |
| **Раздзел III. Лексічная сістэма беларускай мовы** | |
| *Тэма 14.* Лексічнае значэнне слова. Мнагазначнасць.. | 2 |
| *Тэма 15.* Сінанімія, аманімія, паранімія, антанімія лексічных адзінак у беларускай мове. | 2 |
| *Тэма 16.* Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу. | 2 |
| *Тэма 17.* Сферы выкарыстання лексікі. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі.. | 2 |
| **Раздзел IV. Функцыянальныя стылі беларускай мовы** | |
| *Тэма 18.* Навуковы стыль. Афіцыйна-справавы стыль. | 2 |
| *Тэма 19.* Публіцыстычны і мастацкі стыль. Гутарковы стыль. | 2 |
| **Раздзел V. Культура прафесійнага маўлення** | |

| | |
|---|---|
| *Тэма 20*. Культура прафесійнага маўлення. | 2 |
| Усяго: | 34 |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел I. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў

*Тэма 1.* Уводзіны ў дысцыпліну. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў. Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.

*Тэма 2.* Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў. Асноўныя перыяды развіцця беларускай мовы. Старабеларуская літаратурная мова XIV – XVII ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Беларуская літаратурная мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці. Беларуская літаратурная мова XIX – пачатку XX ст. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст.

*Тэма 3.* Беларуская літаратурная мова і дыялекты. Дыялект. Гаворка. Фанетыка-граматычныя рысы паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга дыялектаў.

### Раздзел II. Беларуская мова на сучасным этапе

*Тэма 4.* Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Трасянка (прычыны). Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі. Пурызм. Паняцце літаратурнай нормы.

Асноўныя фанетычныя рысы беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай.

*Тэма 5.* Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім. Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

*Тэма 6.* Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Паняцце прынцыпа арфаграфіі. Прынцыпы беларускага правапісу. Напісанні і правілы, заснаваныя на іх. Традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні. Гісторыя станаўлення беларускіх арфаграфічных норм. Змяненні і ўдакладненні беларускага правапісу як заканамерны працэс развіцця беларускай літаратурнай мовы. Даведнікі па беларускай арфаграфіі.

*Тэма 7.* Марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Класіфікацыя часцін мовы; спрэчныя пытанні. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.

*Тэма 8.* Назоўнік. Агульная характарыстыка лексіка-граматычных разрадаў і катэгорый назоўніка. Несупадзенне ў родзе, ліку і скланенні

назоўнікаў (у параўнанні з рускай мовай). Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў.

*Тэма 9.* Прыметнік. Займенік. Агульная характарыстыка прыметніка як часціны мовы. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў, іх ужыванне ў беларускай і рускай мовах. Утварэнне і ўжыванне форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных форм у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннік. Агульная характарыстыка. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў. Прыметнікі і займеннікі ў тэкстах розных стыляў.

*Тэма 10.* Лічэбнік. Разрады лічэбнікаў. Скаланенне і правапіс лічэбнікаў. Асаблівасці ўжывання і спалучэння лічэбнікаў з іншымі часцінамі мовы.

*Тэма 11.* Дзеяслоў. Агульная характарыстыка форм і катэгорый. Спражэнне. Рознаспрагальныя дзеясловы. Трыванне дзеяслова і яго сувязь з катэгорыяй часу. Ужыванне суфіксаў дзеясловаў у беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай.

*Тэма 12.* Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Прыслоўе. Дзеепрыметнік, асаблівасці ўтварэння і ўжывання ў беларускай мове. Дзеепрыметнік у складзе тэрміналагічных выразаў. Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў з рускай на беларускую мову. Дзеепрыслоўе, асаблівасці ўтварэння і функцыянавання (у параўнанні з рускай мовай). Спецыфіка ў выкарыстанні форм дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя ў прафесійным маўленні. Прыслоўе. Агульная характарыстыка. Асаблівасці ўтварэння і правапіс. Утварэнне форм ступеней параўнання (у параўнанні з рускай мовай).

*Тэма 13.* Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Будова словазлучэнняў у беларускай мове: асаблівасці дзеяслоўнага кіравання. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

## Раздзел III. Лексічная сістэма беларускай мовы

*Тэма 14.* Лексічнае значэнне слова. Мнагазначнасць. Тыпы лексічных значэнняў слова. Монасемантычныя і полісемантычныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слоў. Спецыфіка іх стылістычнага выкарыстання. Тропы, заснаваныя на мнагазначнасці (метафара, метанімія, сінекдаха, антанамазія, эпітэт, літота, гіпербала і інш.). Фразеалогія. Тыпы фразеалагізмаў, іх паходжанне і стылёвыя функцыі. Прыказкі, прымаўкі, афарызмы.

*Тэма 15.* Сінанімія, аманімія, паранімія, антанімія лексічных адзінак ў беларускай мове. Функцыянальнае ўжыванне, стылістычная роля. Тропы з сінанімічнымі, аманімічнымі, паранімічнымі і антанімічнымі адносінамі (аксюмаран, антытыза, антыфразіс, астэізм, эўфемізм, дысфемізм, паранамазія, каламбур).

*Тэма 16.* Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: гістарызмы, архаізмы. Запазычаная лексіка. Прычыны запазычання.

*Тэма 17.* Сферы выкарыстання лексікі. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання (дыялектная, спецыяльная, жаргонная). Дыялектызм. Віды дыялектызмаў: лексічныя, этнаграфічныя, семантычныя, словаўтваральныя, фанетычныя, граматычныя. Жаргон і арго. Спецыяльная лексіка: тэрміны і прафесіяналізмы.

Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя.

## Раздзел IV. Функцыянальныя стылі беларускай мовы

*Тэма 18.* Навуковы стыль. Афіцыйна-справавы стыль. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў (навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы).

Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы (акадэмічны), навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці.

Моўныя сродкі і жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, рэзюмэ і інш.), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення. Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення. Табліцы, графікі, схемы, цытаты, спасылкі, іх афармленне.

Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго характэрныя асаблівасці. Асноўныя рысы і моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, дзелавыя лісты і інш.), правілы іх напісання і афармлення.

Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тэксту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў.

*Тэма 19.* Публіцыстычны і мастацкі стыль. Гутарковы стыль. Асаблівасці і функцыі публіцыстычнага стылю. Падстылі (прамоўніцкі, газетна-публіцыстычны, радыё- і тэлежурналісцкі) і жанры (артыкул, фельетон, эсэ, інтэрв'ю, нататка і інш.).

Мастацкі стыль. Жанравая разнастайнасць. Асаблівасці выкарыстання моўных сродкаў.

Гутарковы стыль, яго асаблівасці. Стылізацыя гутарковага маўлення ў творах мастацкай літаратуры. Дыялог. Палілог. Паняцце "гутарковае слова."

Пераклад на беларускую мову навуковых, афіцыйна-справавых, публіцыстычных, мастацкіх тэкстаў.

## Раздзел V. Культура прафесійнага маўлення

*Тэма 20.* Культура прафесійнага маўлення. Мова і маўленне. Паняцце культуры маўлення. Прафесійна арыентаванае маўленне. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

Правільнасць маўлення і маўленчыя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.

Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.).

Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення.

Маўленчы этыкет. Паняцце камунікатыўнага этыкету. Паўсядзённы этыкет, бытавы, дыпламатычны, святочны, тэлефонны, інтэрнэт-этыкет.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

(па спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з пазначэннем мовы)»)

| Змест | Семінарскія заняткі |
|---|---|
| **Раздзел І. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў** | |
| *Тэма 1.* Уводзіны ў дысцыпліну.<br>Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў. | 2 |
| *Тэма 2.* Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў. | 2 |
| *Тэма 3*. Беларуская літаратурная мова і дыялекты. | 2 |
| **Раздзел ІІ. Беларуская мова на сучасным этапе** | |
| *Тэма 4.* Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. | 2 |
| *Тэма 5.* Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы | 2 |
| *Тэма 6.* Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы. | 2 |
| *Тэма 7.* Марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы. | 4 |
| *Тэма 8*. Назоўнік. | 2 |
| *Тэма 9*. Прыметнік. Займеннік. | 2 |
| *Тэма 10*. Лічэбнік. | 2 |
| *Тэма 11*. Дзеяслоў. | 2 |

| | |
|---|---|
| *Тэма 12*. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. | 2 |
| *Тэма 13*. Прыслоўе. | 2 |
| *Тэма 14*. Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. | 2 |
| **Раздзел III. Лексічная сістэма беларускай мовы** | |
| *Тэма 15*. Лексічнае значэнне слова. Мнагазначнасць.. | 2 |
| *Тэма. 16*. Фразеалогія. | 2 |
| *Тэма 17*. Сінанімія, аманімія, паранімія, антанімія лексічных адзінак у беларускай мове. | 2 |
| *Тэма 18*. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу. | 2 |
| *Тэма 19*. Сферы выкарыстання лексікі. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі.. | 2 |
| **Раздзел IV. Функцыянальныя стылі беларускай мовы** | |
| *Тэма 20*. Навуковы стыль. Афіцыйна-справавы стыль. | 2 |
| *Тэма 21*. Публіцыстычны і мастацкі стыль. Гутарковы стыль. | 4 |
| **Раздзел V. Культура прафесійнага маўлення** | |
| *Тэма 22*. Культура прафесійнага маўлення. | 2 |
| *Тэма 23*. Маўленчы этыкет.  . | 2 |
| Усяго: | 50 |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў

*Тэма 1.* Уводзіны ў дысцыпліну. Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў. Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.

*Тэма 2.* Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў. Асноўныя перыяды развіцця беларускай мовы. Старабеларуская літаратурная мова XIV – XVII ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Беларуская літаратурная мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці. Беларуская літаратурная мова XIX – пачатку XX ст. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст.

*Тэма 3.* Беларуская літаратурная мова і дыялекты. Дыялект. Гаворка. Фанетыка-граматычныя рысы паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга дыялектаў.

## Раздзел II. Беларуская мова на сучасным этапе

*Тэма 4.* Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Трасянка (прычыны). Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі. Пурызм. Паняцце літаратурнай нормы.

Асноўныя фанетычныя рысы беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай.

*Тэма 5.* Арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім. Даведнікі па беларускай арфаэпіі.

*Тэма 6.* Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Паняцце прынцыпа арфаграфіі. Прынцыпы беларускага правапісу. Напісанні і правілы, заснаваныя на іх. Традыцыйныя і дыферэнцыйныя напісанні. Гісторыя станаўлення беларускіх арфаграфічных норм. Змяненні і ўдакладненні беларускага правапісу як заканамерны працэс развіцця беларускай літаратурнай мовы. Даведнікі па беларускай арфаграфіі.

*Тэма 7.* Марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы. Класіфікацыя часцін мовы; спрэчныя пытанні. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.

*Тэма 8.* Назоўнік. Агульная характарыстыка лексіка-граматычных разрадаў і катэгорый назоўніка. Несупадзенне ў родзе, ліку і скланенні назоўнікаў (у параўнанні з рускай мовай). Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў.

*Тэма 9.* Прыметнік. Займеннік. Агульная характарыстыка прыметніка як часціны мовы. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў, іх ужыванне ў беларускай і рускай мовах. Утварэнне і ўжыванне форм ступеней параўнання

якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных форм у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннік. Агульная характарыстыка. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў. Прыметнікі і займеннікі ў тэкстах розных стыляў.

*Тэма 10.* Лічэбнік. Разрады лічэбнікаў. Скалапенне і правапіс лічэбнікаў. Асаблівасці ўжывання і спалучэння лічэбнікаў з іншымі часцінамі мовы.

*Тэма 11.* Дзеяслоў. Агульная характарыстыка форм і катэгорый. Спражэнне. Рознаспрагальныя дзеясловы. Трыванне дзеяслова і яго сувязь з катэгорыяй часу. Ужыванне суфіксаў дзеясловаў у беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай.

*Тэма 12.* Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Дзеепрыметнік, асаблівасці ўтварэння і ўжывання ў беларускай мове. Дзеепрыметнік у складзе тэрміналагічных выразаў. Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў з рускай на беларускую мову. Дзеепрыслоўе, асаблівасці ўтварэння і функцыянавання (у параўнанні з рускай мовай). Спецыфіка ў выкарыстанні форм дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя ў прафесійным маўленні.

*Тэма 13.* Прыслоўе. Агульная характарыстыка. Разрады. Асаблівасці ўтварэння і правапіс. Ужыванне форм ступеней параўнання (у параўнанні з рускай мовай).

*Тэма 14.* Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Будова словазлучэнняў у беларускай мове: асаблівасці дзеяслоўнага кіравання. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

## Раздзел III. Лексічная сістэма беларускай мовы

*Тэма 15.* Лексічнае значэнне слова. Мнагазначнасць. Тыпы лексічных значэнняў слова. Монасемантычныя і полісемантычныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слоў. Спецыфіка іх стылістычнага выкарыстання. Тропы, заснаваныя на мнагазначнасці (метафара, метанімія, сінекдаха, антанамазія, эпітэт, літота, гіпербала і інш.).

*Тэма 16.* Фразеалогія. Тыпы фразеалагізмаў, іх паходжанне і стылёвыя функцыі. Прыказкі, прымаўкі, афарызмы.

*Тэма 17.* Сінанімія, аманімія, паранімія, антанімія лексічных адзінак ў беларускай мове. Функцыянальнае ўжыванне, стылістычная роля. Тропы з сінанімічнымі, аманімічнымі, паранімічнымі і антанімічнымі адносінамі (аксюмаран, антытыза, антыфразіс, астэізм, эўфемізм, дысфемізм, паранамазія, каламбур).

*Тэма 18.* Лексіка беларускай мовы паводле паходжання. Лексіка актыўнага і пасіўнага запасу. Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: гістарызмы, архаізмы. Запазычаная лексіка. Прычыны запазычання.

*Тэма 19.* Сферы выкарыстання лексікі. Стылістычная дыферэнцыяцыя лексікі. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання (дыялектная, спецыяльная, жаргонная). Дыялектызм. Віды дыялектызмаў:

лексічныя, этнаграфічныя, семантычныя, словаўтваральныя, фанетычныя, граматычныя. Жаргон і арго. Спецыяльная лексіка: тэрміны і прафесіяналізмы.

Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе. Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя.

## Раздзел IV. Функцыянальныя стылі беларускай мовы

*Тэма 20.* Навуковы стыль. Афіцыйна-справавы стыль. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў (навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы).

Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы (акадэмічны), навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці.

Моўныя сродкі і жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, рэзюмэ і інш.), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення. Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення. Табліцы, графікі, схемы, цытаты, спасылкі, іх афармленне.

Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго характэрныя асаблівасці. Асноўныя рысы і моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, дзелавыя лісты і інш.), правілы іх напісання і афармлення.

Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тэксту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў.

*Тэма 21.* Публіцыстычны і мастацкі стыль. Гутарковы стыль. Асаблівасці і функцыі публіцыстычнага стылю. Падстылі (прамоўніцкі, газетна-публіцыстычны, радыё- і тэлежурналісцкі) і жанры (артыкул, фельетон, эсэ, інтэрв’ю, нататка і інш.).

Мастацкі стыль. Жанравая разнастайнасць. Асаблівасці выкарыстання моўных сродкаў.

Гутарковы стыль, яго асаблівасці. Стылізацыя гутарковага маўлення ў творах мастацкай літаратуры. Дыялог. Палілог. Паняцце “гутарковае слова.”

Пераклад на беларускую мову навуковых, афіцыйна-справавых, публіцыстычных, мастацкіх тэкстаў.

## Раздзел V. Культура прафесійнага маўлення

*Тэма 22.* Культура прафесійнага маўлення. Мова і маўленне. Прафесійна арыентаванае маўленне. Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

Правільнасць маўлення і маўленчыя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.

Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.).

Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення.

*Тэма 23.* Маўленчы этыкет. Паняцце камунікатыўнага этыкету. Паўсядзённы этыкет, бытавы, дыпламатычны, святочны, тэлефонны, інтэрнэт-этыкет.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Асноўная літаратура

1. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2017. – 588 с.

2. Грыгор’ева, Л. М. Сучасная беларуская мова : зб. практыкаванняў / Л. М. Грыгор'ева, Г. Ф. Андарала. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 368 с.

3. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 20 т. Т. 7 : Беларуская мова / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2017. – 496 с.

## Дадатковая літаратура

1. Багамолава, А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення : падручнік / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мінск : РІВШ, 2017. – 344 с.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 351 с.

3. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. Ч. 2 : Сінтаксіс / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 240 с.

4. Кныш, Л. С. Практыкум па беларускай мове / Л. С. Кныш, В. У. Барысенка, Т. Г. Казакевіч ; Мінскі дзярж. лінгвіст. ун-т ; рэц. І. С. Камінская. – Мінск : МДЛУ, 2020. – 240 с.

5. Кузьміч, В. А. Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / В. А. Кузьміч, В. В. Шахаб ; Беларус. дзярж. тэхнал. ун-т. – Мінск : БДТУ, 2008. – 240 с.

6. Куліковіч, У. І. Новае ў беларускай арфаграфіі : правілы, заданні, тэсты, давед. матэрыял / У. І. Куліковіч ; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча. – 2-е выд., дап. – Мінск : Новое знание, 2010. – 128 с.

7. Лепешаў, І. Я. Практыкум па беларускай мове : вучэб. дапаможнік / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 333 с.

8. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. / пад рэд. Л. М. Грыгор’евай. – 4-е выд., выпр. – Мінск : Выш. шк., 2011. – 622 с.

9. Шкраба, І. Р. Сучасная беларуская мова. Марфалогія / І. Р. Шкраба. – Мінск : Сэр-Вит, 2007. – 304 с.

Інфармацыйна-даведачныя выданні

1. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад.: В. П. Русак [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 757 с.

2. Беларускі арфаграфічны слоўнік / уклад.: Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандрацэня ; пад рэд. А. А. Лукашанца ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – 3-е выд., выпр., нов. арфаграф. напіс. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 695 с.

3. Беларуска-рускі слоўнік = Белорусско-русский словарь : у 3 т. / пад рэд. А. А. Лукашанца ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа. – 4-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2012. – 3 т.

4. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : актуальная лексіка / А. М. Булыка. – Мінск : Харвест, 2005. – 336 с.

5. Граматычны слоўнік назоўніка / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад.: Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 1379 с.

6. Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка, прыслоўя / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы ; уклад.: Н. П. Еўсіевіч [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 1135 с.

7. Клышка, М. К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. К. Клышка. – Мінск : Радыёла-Плюс, 2005. – 672 с.

8. Смаршчок, М. Ф. Беларускія аднакарэнныя і сугучныя словы з рускімі адпаведнікамі : слоўнік-даведнік / М. Ф. Смаршчок, Э. І. Барысаглебская ; Мінскі дзярж. лінгвіст. ун-т. – Мінск : МДЛУ, 2002. – 296 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Састаўным элементам прафесійна арыентаванага навучання з’яўляецца самастойная работа, якая ўключае разнастайныя віды пазааўдыторнай работы студэнта (практыкаванні лексіка-грамтычнага і семантыка-стыістычнага характару, вусныя і пісьмовыя жанрава-стылістычныя заданні, пераклады тэкстаў па спецыяльнасці з рускай мовы на беларускую, маналагічныя тэматычна абумоўленыя выступленні, дыялогі-дыскусіі на вызначаную групай тэму і інш.). Для ацэнкі самастойнай работы праводзіцца аўдыторны і індывідуальны кантроль з боку выкладчыка.

Для самастойнага вывучэння асобных тэм вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» можа выкарыстоўвацца агульны спіс літаратуры, а таксама спіс літаратуры, падабраны асобна па кожнай тэме. Гэта дае магчымасць студэнтам самастойна засвоіць вылучаныя тэмы. Пры выкананні дадзенага віду працы студэнты вучацца самастойна выбіраць, сістэматызаваць, ілюстраваць пэўны тэарэтычны матэрыял, а таксама выпрацоўваць уменне прымяняць адпаведныя веды на практыцы не толькі пры развіцці вуснага, але і пры ўдасканаленні пісьмовага маўлення. Формы кантролю могуць быць разнастайнымі і ажыццяўляцца ў выглядзе калёквіуму, абмеркавання рэфератаў, прагляду творчых работ і прэзентацый, апытанняў на аўдыторных занятках і інш.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– выкарыстанне тэставых заданняў;
– правядзенне пісьмовых праверачных работ;
– рознаўроўневыя пісьмовыя заданні;
– лінгвістычны аналіз тэкстаў;
– пераклад;
– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах вучэбнай дысцыпліны;
– распрацоўка і прэзентацыя праектаў па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны;
– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны;
– вуснае апытванне студэнтаў на практычных занятках;
– экзамен.

## ПАТРАБАВАННІ ДА НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ ПРАХОДЖАННІ БЯГУЧАЙ АТЭСТАЦЫІ

Для ацэнкі вынікаў вучэбных дасягненняў выкарыстоўваюцца крытэрыі, рэкамендаваныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.